

Моладзь з АД “OPEN” да Дня інваліда і Калядаў рыхтуе дабрачынныя акцыі на карысць хворых дзяцей Гродна.

- *2 снежня разам з моладдзю мы пойдзем у Гродзенскі цэнтр медыцынскай рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў і хворых на ДЦП, падорым ім салодкія падарункі і пагуляем разам з імі,* – распавёў кіраўнік моладзевага душпастырства
**кс. Антоні Грэмза**
.

У гэты дзіцячы цэнтр, а таксама карэкцыйны цэнтр Гродна, каталіцкая моладзь пойдзе і 19 снежня, напярэдадні Божага Нараджэння, з калряднымі падарункамі.

- *Грошы на гэтыя падарункі мы будзем збіраць 11 снежня з ахвяраванняў падчас акцыі “Пячэнька за пячэнька”, якая штогод праводзіцца ў Фарным касцёле* .

У гэтую нядзелю 4 снежня моладзь у Фарным касцёле прэзентуе вынікі папярэдніх дабрачынных акцый.

- *Наша моладзь хоча больш дапамагчы безабаронным людзям, у дадзеным выпадку хворым дзеткам. Я ведаю, яшчэ ўзнікла такая думка, каб сабраць грошы на ноутбук хлопцу-інваліду, які часам сядзіць каля Фарнага касцёла* , - дадаў к**с. Антоні.**